ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Панядзелак, 22 лістапада 1937 г. № 62 (333)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Аддамо галасы барацьбітам за справу партыі Леніна—Сталіна

Ленінскае вучэнне аб дыктатуры рабочага класа прайшло за дваццаць год пераможным, трыумфальным шэствіем па ўсёй нашай неабсяжнай радзіме. Вынікі ператварэння ў жыццё вялікіх ідэй Леніна, ідэй, аб якіх марыла чалавецтва, адлюстраваны і замацаваны ў гістарычным дакуменце, які адкрыў новую эпоху ў чалавечым грамадстве,—у Сталінскай Канстытуцыі.

Сталінская Канстытуцыя—гэта вынік перамог ленінскага вучэння. Гэтая Канстытуцыя ёсць неабвяргальнае сведчанне велізарнай жыццёвасці дыктатуры рабочага класа, сведчанне яе магутнай сілы, якая здольна перабудаваць свет на новых асновах—на асновах комунізма.

Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная рэволюцыя, кіруемая партыяй Леніна—Сталіна, вызваліла і ўзняла да жыцця ўсе раней прыгнечаныя нацыянальнасці былой царскай Расіі. Перамогі соцыялізма ў СССР зрабілі гэтыя нацыянальнасці роўнапраўнымі сярод народаў вялікага Совецкага Саюза; ператварылі іх у свабодныя квітнеючыя народы, якія ўзняліся да вышынь культуры і навукі; гаспадарку гэтых народаў яны ператварылі з дзікай і адсталай у перадавую індустрыяльную і калгасную.

З перамогай соцыялізма знішчана векавая варожасць паміж нацыянальнасцямі, выхавана пачуццё ўзаемнай дружбы, створана братэрскае супрацоўніцтва народаў у сістэме адзінай совецкай дзяржавы, якая прадстаўляе зараз адзіную сям'ю.

Усе працоўныя Саюза Советаў прыходзяць да выбараў у Вярхоўны Совет, ажыццяўляючы свае правы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, як роўнапраўныя члены вялікай сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза.

Совецкая Беларусь з краіны жабрацкай, адсталай ператварылася пад мудрым кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна ў краіну фабрык і заводаў, у краіну квітнеючых гарадоў і калгасаў. Беднякі і серадня́кі, якія па закліку партыі і совецкай улады ўвайшлі ў калгасы, цяпер сталі людзьмі заможнымі, якія жывуць поўнакроўным жыццём свядомых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства. Калгасны лад прынёс селяніну светлае і радаснае жыццё. Радасна жыць і тварыць у нашу эпоху, у эпоху Сталінскай Канстытуцыі.

Канстытуцыя перамогшага соцыялізма—гэта велізарнейшы «гістарычны дакумент, які трактуе... аб фактах перамогі соцыялізма ў СССР, аб фактах вызвалення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, аб фактах перамогі ў СССР разгорнутай, да канца паслядоўнай дэмакратыі» (Сталін). Ён «узбройвае духоўна наш рабочы клас, наша сялянства, нашу працоўную інтэлігенцыю. Гэта рухае наперад і ўзнімае пачуццё законнай гордасці. Гэта ўмацоўвае веру ў свае сілы і мабілізуе на новую барацьбу для заваёў новых перамог комунізма» (Сталін).

Наша краіна ўступіла ў рашаючы этап выбарчай кампаніі. У гарадах і вёсках разгортваецца большэвіцкая агітацыя за кандыдатаў у дэпутаты, вылучаных грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных, за кандыдатаў, якія падтрыманы акруговымі выбарчымі нарадамі і зарэгістраваны акруговымі выбарчымі камісіямі.

Вынікі выстаўлення кандыдатаў паказваюць, што совецкі народ вылучае кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета саратнікаў Леніна, выпрабаваных барацьбітоў за справу працоўных—за комунізм. Сваім першым кандыдатам совецкі народ вылучыў любімага правадыра працоўных таварыша Сталіна, чыё імя стала сімвалам велізарнейшых перамог соцыялізма, светлага і радаснага жыцця,—творца Канстытуцыі, якая адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва.

Вылучаны таксама кандыдатуры лепшых саратнікаў і вучняў таварыша Сталіна, якія карыстаюцца ўсенароднай любоўю—таварышоў Молатава, Кагановіча, Варашылава, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Чубара, Касіора, Жданава, Ежова, Эйхе, Хрушчова і іншых членаў ЦК ВКП(б).

Працоўныя Совецкай Беларусі, ажыццяўляючы сваё права выбіраць і быць выбранымі, вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР лепшых сыноў і дачок сваёй краіны. Яны вылучылі бліжэйшага саратніка таварыша Сталіна наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава, кіраўнікоў партыі і совецкай улады. Кандыдатамі ў дэпутаты вылучаны таксама перадавыя людзі—работнікі акруговых і раённых партыйных і совецкіх органаў. Вылучаны арганізатары соцыялістычнай вытворчасці, стаханаўцы і стаханаўкі—людзі, якія сваёй работай даказалі адданасць справе народа, справе партыі Леніна—Сталіна.

З часу Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі працоўныя СССР на справе пераканаліся, што толькі ў большэвікоў партыйных і непартыйных словы не разыходзяцца са справай, што толькі яны з'яўляюцца сапраўднымі прадстаўнікамі народа, якія цвёрда стаяць пад сцягам комуністычнай партыі.

Працоўныя Совецкай Беларусі асабліва ганарыцца сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Кліменціем Ефрэмавічам Варашылавым, жыццё якога з'яўляецца слаўным жыццём рэволюцыянера-большэвіка, неразрыўна звязанага з мудрай комуністычнай партыяй, авангардам рабочага класа, які нястомна вядзе барацьбу за вызваленне ўсяго працоўнага чалавецтва ад капіталістычнага рабства, жабрацтва і невуцтва, за светлае і шчаслівае жыццё, за комунізм.

Мы з найвялікшай радасцю аддамо свае галасы за Вас, Кліменцій Ефрэмавіч, як вернага сына нашай большэвіцкай партыі і вялікага працоўнага народа нашай краіны, бліжэйшага саратніка найвялікшых людзей нашай эпохі Владзіміра Ільіча Леніна і Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Знаходзячыся на рубяжы з фашысцкім Захадам, дзе фашызм папірае ўсе дасягненні навукі і культуры, дзе ён ліквідуе апошнія рэшткі нават так званых «дэмакратычных свабод», аплёўвае соцыялістычны рух рабочага класа і змешвае з граззю дэмакратычныя імкненні лепшых людзей цывілізаванага свету, падрыхтоўваючы напад на СССР—бацькаўшчыну ўсіх працоўных. Фашыстаў усіх краін яднае нянавісць да Совецкага Саюза, радзімы сапраўднага дэмакратызма. Фашысцкія ўрады Германіі, Італіі і Японіі заключылі саюз для барацьбы з комунізмам—фактычна для барацьбы супроць Совецкага Саюза. Для нападу на Совецкі Саюз фашызм мабілізуе ўсе свае сілы, бо ён ведае, што працоўныя Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, стварылі непераможную Чырвоную Армію, якою былі разбіты палкі чатырнаццаці капіталістычных краін.

Рабочыя і калгаснікі Совецкай Беларусі, якія спакойна працуюць на соцыялістычных палях, фабрыках і заводах, добра ведаюць, што гэтым яны абавязаны комуністычнай партыі, магутнасці Чырвонай Арміі і яе правадыру таварышу Кліменцію Ефрэмавічу Варашылаву.

З мэтай абараніцца ад нападу класавага ворага соцыялістычная краіна ўзброіла Чырвоную Армію найлепшай сучаснай ваеннай тэхнікай, дала ёй сваіх лепшых сыноў.

Чырвоная Армія ахоўвае мір не толькі ў нашых рубяжах,—моц РСЧА з'яўляецца захавальнікам міру ва ўсім свеце.

Таварышу Варашылаву, жалезнаму наркому, палкаводцу Чырвонай Арміі, якая абараняе мір не толькі для працоўных Совецкага Саюза, але і для працоўных усіх краін, працоўныя БССР *аддадуць свае галасы.*

Совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў БССР павінны дзейна праводзіць большэвіцкую агітацыю за кандыдатаў. Як майстры слова, яны ў мастацкай форме павінны разгарнуць вялікую па свайму размаху і глыбокую па ідэйнай насычанасці агітацыйна-растлумачальную работу, паказваючы ў літаратурнай форме гераізм, адданасць радзіме, і вялікую напружаную работу і жыццё нашых кандыдатаў, што прывяло іх у шэрагі лепшых людзей совецкага народа.

З незвычайным энтузіязмам працоўныя краіны рабочых і сялян рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет Саюза. У вялікую гістарычную дату 12-га снежня народы СССР прадэманструюць сваю адданасць партыі Леніна—Сталіна, яны прадэманструюць магутнасць перамогшага соцыялізма ў нашай краіне і развіццё паслядоўнага дэмакратызма. Ажыццяўляючы прынцыпы соцыялізма, соцыялістычны дэмакратызм, дыктатура рабочага класа выклікала шырокія працоўныя масы да актыўнага палітычнага жыцця, узняла іх і здолела ператварыць іх у апору совецкай улады. Гэта, перш за ўсё, адносіцца да нацыянальных рэспублік, дзе выраслі тысячы і мільёны новых людзей—свядомых будаўнікоў соцыялізма.

Дом Чырвонай Арміі імя першага маршала Совецкага Саюза т. К. Е. Варашылава ў Менску.

Тэатры Менска ў выбарчай кампаніі

Тэатры сталіцы Беларусі—Менска прымаюць актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі.

Так, Тэатр оперы і балета рыхтуе канцэртную праграму, прысвечаную кандыдату ў Совет Саюза вялікаму палкаводцу Чырвонай Арміі таварышу К. Е. Варашылаву. Да ўдзелу ў канцэрце прыцягнуты лепшыя сілы тэатра: засл. арт. рэспублікі тав. Александроўская, артысты: Балоцін, Млодэк, Арсенка, Рыдыкульцаў і хор.

БДДТ паказвае інтэрмедыю з Пісьма беларускага народа таварышу Сталіну. Яўрэйскі тэатр дэманструе інтэрмедыю З. Аксельрода і Э. Кагана, у якой высьмейваюцца «выбары» пры цару і ярка адлюстроўваецца веліч Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Апрача гэтага, перад кожным спектаклем акторы дэкламуюць вершы аб Канстытуцыі, выбарчым законе і аб кандыдатах у дэпутаты.

ПІСЬМО таварышу СТАЛІНУ
АД СХОДА СТАХАНАЎЦАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ СТАЛІНСКАГА РАЁНА гор. МАСКВЫ

ЦК ВКП(б)—таварышу СТАЛІНУ

Мудраму правадыру, настаўніку і другу ўсіх працоўных,—Вам, таварыш **Сталін**, мы, стаханаўцы раёна, які носіць Вашае імя, шлем сваё першае слова любві, сваё гарачае пролетарскае прывітанне!

Мы сабраліся на наш раённы сход для таго, каб дастойна адзначыць той найвялікшы гонар і давер'е, якое аказана нам—выбаршчыкам Сталінскай выбарчай акругі—Цэнтральным Камітэтам партыі і Вамі, таварыш **Сталін**, даўшым сваю згоду балатыравацца па нашай выбарчай акрузе.

Мы бязмерна шчаслівы аказаным нам давер'ем і лічым сваім абавязкам адказаць на гэта энергічнай стаханаўскай работай.

Родны Іосіф Вісарыёнавіч, Вам, геніяльнаму натхніцелю вялікіх соцыялістычных перамог, Вам, хто сваімі рукамі выпеставаў, накіроўваў і арганізоўваў стаханаўскі рух, мы клянемся, што ўсе свае сілы, увесь свой рэволюцыйны запал, усе свае здольнасці прыкладзем да таго, каб у дзень 12 снежня 1937 года прынесці да выбарчых урнаў не толькі з выбарчым бюлетэнем, у якім будзе ўнесена Ваша слаўнае імя, але і адначасова рапартаваць Вам, родны таварыш **Сталін**, аб новых вытворчых перамогах на кожным заводзе, на кожнай фабрыцы.

Вялікія і грандыёзныя перамогі соцыялізма, дасягнутыя нашай краінай пад Вашым, таварыш **Сталін**, мудрым кіраўніцтвам.

Нашае цудоўнае жыццё ў шчаслівай, свабоднай магутнай совецкай краіне ўвянчана найвялікшым дакументам эпохі—нашай новай Канстытуцыяй, якую ўвесь наш народ называе Сталінскай Канстытуцыяй. Багата слаўных старонак знатныя людзі нашай краіны—стаханаўцы—упісалі ў гісторыю барацьбы за датэрміновае выкананне плана вялікіх работ, плана другой пяцігодкі.

Мы, стаханаўцы прадпрыемстваў Сталінскага раёна, запэўняем Вас, Іосіф Вісарыёнавіч, што пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі мы разгорнем яшчэ шырэй стаханаўскі рух і большэвіцкай работай на фабрыках і заводах даб'емся новых перамог, дастойных такога гістарычнага дня, як выбары ў Вярхоўны Совет, на падставе самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі—нашай Сталінскай Канстытуцыі.

Любімы Іосіф Вісарыёнавіч!

Мы, стаханаўцы, разам з усімі працоўнымі, бязмерна шчаслівы тым, што 12 снежня будзем мець гонар выразіць сваім галасаваннем надзеі і волю ўсяго працоўнага народа—абраць Вас першым дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР.

Рыхтуючыся сустрэць гэты знамянальны для нас дзень новымі вытворчымі перамогамі, дастойнымі імя правадыра, натхніцеля і арганізатара перамог соцыялізма ў нашай краіне, мы па-баявому правядзем дні, якія засталіся да выбараў, і заклікаем усіх рабочых, інжынераў і тэхнікаў з 1 па 10 снежня правесці сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў.

Мы ўпэўнены, што і надалей шчыльна згуртаваўшы свае рады вакол партыі Леніна—Сталіна, маючы на чале нашых пролетарскіх калон такога геніяльнага стратэга пролетарскай рэволюцыі, як Вы, Іосіф Вісарыёнавіч,—мы пойдзем наперад па шляху заваёў новых вышынь комунізма.

Няхай жыве наш магутны, свабодны народ!

Няхай жыве наша слаўная, усёнерамагаючая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі арганізатар перамог соцыялізма наш родны **Сталін!**

ПРЭЗІДЫУМ СХОДА.

Камдыў Гарачоў

Мы красная кавалерия...

Першае мая. Ясны дзень. Аграмаднае веснавое сонца купае сталіцу ў праменнях яркага святла. Парад. Бясконцымі калонамі пяхоты, танкаў, кавалерыі, артылерыі, інжынерных войск, дэманструючы свету сваю магутнасць, ідзе непераможная Чырвоная Армія. У глыбокім небе ірдзеюць магутныя флатыліі авіяцыі. Хочацца спяваць, радавацца нязведанай радасцю. Бачачы магутнасць Чырвонай Арміі, адчуваеш сябе, як грамадзянін СССР, самым магутным, незалежным і шчаслівым у свеце. Вось аркестры каля трыбуны ўступілі месца зборнаму коннаму аркестру, мелодыя марша змянілася—зазвінелі пад галоп трубы коннікаў... Узмятнуліся на лёгкім ветры чырвоныя сцягі, баявыя сцягі рэволюцыі, аб якіх складзены песні; баявыя штандары Першай коннай, сведкі гістарычных паходаў і слаўных баёў за рэволюцыю. Яны бачылі Растоў, яны горда развяваліся ў руках герояў, прайшлі Чангарскі мост і былі амыты салёнай вадой Сіваша. Пры відзе іх дрыжэлі белапольскія паны... І вось зараз, слаўныя чырвонаармейскія палкі, гэтыя баявыя рэліквіі нагадваюць славу мінулых баёў. На перадзе на жвавым кані іх вядзе камандзір корпуса, патрыёт соцыялістычнай радзімы, годны сын таварыша Сталіна, слаўны данскі казак Елісей Іванавіч Гарачоў.

❦

От края и до края, от моря и до моря берет винтовку народ трудовой...

Кастрычнік змёў устаноўлены пасля Лютаўскай рэволюцыі буржуазна-капіталістычны парадак і канчаткова сарваў усякія спробы прадаўжаць імперыялістычную вайну. Белыя генералы, якія ўцяклі з рэволюцыйнага Петраграда і Стаўкі ў горад Новачаркаск, сталіцу войска данскога, звілі тут асінае гняздо рэакцыі. Контррэволюцыйны Данскі вайсковы круг, дзе засядалі Каледзіны, Красновы, Карнілавы, Афрыканы, Багаеўскія і іншая генеральская сволач, рыхтавалі на маладую Совецкую рэспубліку паход. У гэты час з верхняга Дона на Новачаркаск вёў на барацьбу з белымі гадамі чырвоны паўстанцкі атрад легендарны Падцелкаў. Казак Елісей Гарачоў, будучы выбарным камандзірам 6-га Данскога казачага палка, што кватэраваў у Новачаркаску, узняўшы полк, пакідае Новачаркаск і злучаецца з рэволюцыйным атрадам Падцелкава.

Расфарміроўваюцца рэшткі апошніх палкоў старой рускай арміі і Гарачоў, нарэшце, трапляе ў свой родны хутар Пескаватку. Але спакойна пражыць не ўдаецца і тыдня. Разжырэўшыя за вайну данскія кулакі, што прытаіліся да пары да часу, узнімаюцца супроць совецкай улады. Фармуюцца белыя атрады атаманцаў, на чале іх становіцца былое залатапагоннае данское афіцэрства, дзеці кулакоў, сыны данскіх памешчыкаў. Станіца Галубінская—цэнтр і апора белагвардзейшчыны. Былыя франтавікі і беднейшае казацтва фармуюць свае чырвоныя партызанскія атрады і вядуць барацьбу супроць белых банд. Казак Елісей Гарачоў арганізуе чырвоны казачы атрад і б'ецца з белымі гадамі. Абкружаны атаманцамі, яго атрад 24 дні стрымлівае на адным з данскіх хутароў націск ворага.

Пасланы па асобаму ўказанню таварыша Сталіна на дапамогу слаўным партызанам, атрад Папова выручае гарачоўцаў з белагвардзейскага кальца. Гарачоў з сваімі людзьмі ўліваецца ў 4-ю Кавалерыйскую дывізію, якою ў той час камандаваў таварыш Будзённы.

З гэтага моманту пачалася баявая біяграфія т. Гарачова ў радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дзенікіншчына. Белапалякі. Врангель. Махно.—Вось гістарычныя этапы барацьбы, праз якія прайшла баявая дзейнасць і жыццё слаўнага камандзіра чырвонай конніцы Елісея Іванавіча Гарачова.

Перыяд польскай акупацыі запісаны крывавымі рубцамі на спіне працоўнага беларускага народа.

Арламі наляталі на белапольскую нечысць гераічныя палкі Першай коннай і растропшы іх, пагналі назад, да Варшавы.

Невялікае мястэчка Радзівілы і прыкмет асаблівых не мае, але, паводле вестак разведкі, значэнне яго для Першай коннай вялікае,—небяспечнае мястэчка. У Радзівілах размясцілася пяхотная дывізія. Каму даручыць адказную баявую задачу? Каму-ж, як не камандзіру палка Гарачову! Уначы на 6-е верасня полк Гарачова, бясшумна падыйшоўшы да Радзівілаў, зрабіў кавалерыйскі налёт, не пісаны ў статутах, але выпрацаваны ў баявых традыцыях Першай коннай. Вынік: у палоне два пяхотныя белапольскія палкі 600 улан, затрафеена шмат кулямётаў і гармат. Малады (тады яму было толькі 26 год), з гарачым сэрцам камдалка т. Гарачоў атрымлівае вышэйшую рэволюцыйную узнагароду — ордэн «Чырвоны Сцяг».

Следам за гэтым баявым подвігам—другі подвіг. Украіна. Адной з белагвардзейскіх дывізій камандуе люты вораг рэволюцыі генерал Куцёпаў, які «достославно» скончыў сваю контррэволюцыйную кар'еру некалькі год таму назад у Парыжы. Полк т. Гарачова абкружае дывізію Куцёпава і, не даўшы ёй апомніцца, громіць яе, знішчыўшы бясследна і канчаткова. Другі ордэн «Чырвоны Сцяг» упрыгожвае баявыя грудзі Елісея Іванавіча Гарачова.

❦

Кубань. У сяле Белае да Майкопа рухаецца паўтаратысячная банда белага генерала Пржэвальскага.

Ноч. Штаб брыгады. Ля тэлефона камбрыг Гарачоў. Размова з штабам арміі. Камандзір брыгады Гарачоў напружана-ўважлівы. Апошнія словы Гарачова «загад будзе выкананы». Павешана трубка. Гарачоў паварочваецца да камандзіраў. Яго словы: «Клеменцій Ефрэмавіч загадаў разграміць банду Пржэвальскага». Камбрыг задумаўся.

На ілбе сабраліся змаршчыны. Позірк у карту. Кароткія загады.

Сігнал «сядлоўка» суха прагучэў у цішы кубанскай ночы і, агаласіўшы даліну, замёр у горах. 500 шабляў у конным страі чакалі загадаў. Рушыліся ў калоне па тры. Ішлі рыссю—прыглушана звінела жалеза збруі. Вораг блізка. Шэптам па калоне перадаецца каманда. На пад'ёме спыніліся.

— Кулямёты к пешаму строю, назіранне ўлева.

— Астатнія за мной, галопам—марш!

Цёмная паўднёвая ноч праглынула ўсё. Наступіла поўная цішыня. У далечы маячылі агні горада Майкопа. Гаслі і зноў паяўляліся ў высокім небе зоркі. Сям-там парушаў цішыню запознены дзяргач. У цемры шэрай плямай мутнела дарога.

Бандыты наперад смакавалі багатую спажыву пры разгроме Майкопа. Чырвоных чаго баяцца—якіх-небудзь 400 шабляў, а іх паўтары тысячы, ды адзін бацька-атаман чаго варты!

Скора і Майкоп. Вось ужо і агні відаць.

Раптам затрашчалі кулямёты. Чоткі строкат кулямётаў у начной цішы. Кінжальным боем бязлітасны агонь кулямётаў нішчыў калону белабандытаў.

— Аддзяленнямі налева — галопам марш!.. Назад—марш!

Спазнілася каманда. А тут яшчэ выглянуў з-за гор месяц. Нясліся кавалерысты, змятаючы ўсё на сваім шляху. Наперадзе камбрыг Гарачоў. Бандыты не паспелі перастроіцца да атакі, як іх пачалі сячы з хваста і ў цэнтры калоны байцы Гарачова.

Раніцай камбрыг Гарачоў данёс таварышу Варашылаву: «Загад выкананы. Банда генерала Пржэвальскага ліквідавана».

Трэці ордэн «Чырвоны Сцяг» упрыгожыў грудзі гераічнага, адважнага чырвонага камбрыга т. Гарачова.

❦

Вось у кароткіх словах баявы, поўны гераізма, шлях слаўнага камандзіра Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, выхаванага партыяй Леніна—Сталіна, аддане́йшага рэволюцыі байца, Елісея Іванавіча Гарачова. У 1919 годзе т. Гарачоў уступіў у рады комуністычнай партыі.

Цяпер таварыш Елісей Іванавіч Гарачоў камандзір корпуса.

❦

Асобае пасяджэнне Вярхоўнага суда. Перад судом — раскрытая органамі НКВД подлая прадажная зграя фашысцкіх агентаў і шпіёнаў здраднікаў нашай радзімы, нечуваных злачынцаў. У складзе суда камандзір корпуса камдыў т. Гарачоў. Усё жыццё ён змагаўся з ворагамі радзімы і рэволюцыі, змагаўся са зброяй у руках, кроўю і жыццём. Да подлых наймітаў фашызма ён праяўляе бязлітаснасць да канца. Смерць гадам!

❦

Калі сустракаеш гэтага слаўнага камдыва, з сівізною на скронях, героя-ордэнаносца, чалавека з бясхітраснымі шэрымі вачамі, які ўмее і весела пажартаваць і аддаць каманду магутным палкам нашай слаўнай гераічнай Чырвонай арміі—праяўляе жаданне стаць за фронт і прыняць каманду на бой за радзіму, за рэволюцыю... Гарачоў авалодае тваімі пачуццямі байца і грамадзяніна. Хоць і пакрыла сівізна яго скроні, але як баец ён малады, і ў будучых бітвах ворагі краіны Советаў зноў адчуюць сілу яго ўдараў.

Працоўныя нашай радзімы любяць сваю родную Чырвоную Армію, як сваё дзецішча, любяць яе камандзіраў і кіраўнікоў.

Елісей Іванавіч—лепшы з лепшых у яе слаўных радах.

Дзесяткі тысяч выбаршчыкаў Асіповіцкай выбарчай акругі з вялікай радасцю апусцяць свой бюлетэнь за вартага кандыдата ў члены Совета Нацыянальнасцей ад сваёй акругі, за гераічнага камандзіра, Елісея Іванавіча Гарачова.

Вл. ГЛАЗЫРЫН.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР,

ЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ АКРУГОВЫМІ ВЫБАРЧЫМІ КАМІСІЯМІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ПА ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Д. Ф. МАРКІН

Н. П. ЛІСУНОВА

В. М. ГАНЧАРОЎ

А. І. МАЦЮШЭНКА

С. С. ЕЎМЕНАВА

М. В. КУЛАГІН

ПАСТАНОВА

Слуцкай акруговай гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей таварыша

Міхаіла Васільевіча Кулагіна

Разгледзеўшы паступіўшыя пастановы сходаў рабочых і служачых сельгасмайстэрні гор. Слуцка, арцелі імя Молатава, арцелі «Ўдарнік» і калгаснікаў калгаса «Новы свет», Старадарожскага раёна, аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты ў Совет Нацыянальнасцей па Слуцкай гарадской выбарчай акрузе Кулагіна Міхаіла Васільевіча і кіруючыся артыкуламі 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, акруговая гарадская выбарчая камісія па Слуцкай выбарчай акрузе па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ПАСТАНАЎЛЯЕ:

зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Слуцкай гарадской выбарчай акрузе вылучанага агульнымі сходамі рабочых і служачых слуцкай сельгасмайстэрні, арцелі імя Молатава, арцелі «Ўдарнік» і калгаснікамі калгаса «Новы свет», Старадарожскага раёна, Кулагіна Міхаіла Васільевіча, нараджэння 1900 года, члена ВКП(б) з 1928 года, зараз выконваючага абавязкі старшыні слуцкага акрвыканкома, пражываючага ў г. Слуцку.

Старшыня Слуцкай акруговай гарадской па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбарчай камісіі **Эзрын.** Нам. старшыні **Мохунь.** Сакратар **Казлоўскі.** Члены камісіі: **Ароніна, Лейбовіч, Жукавец, Гамановіч.**

ПАСТАНОВА

Магілеўскай гарадской акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей таварыша

Ніны Пятроўны Лісуновай

На падставе артыкулаў 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР і згодна прадстаўленым дакументам: а) пратакола агульнага сходу рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Магілеўскай фабрыкі штучнага валакна імя Куйбышэва ад 28 кастрычніка 1937 года, на якім прысутнічала 1.050 чалавек, аб вылучэнні тав. Лісуновай Ніны Пятроўны кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Магілеўскай гарадской выбарчай акрузе № 60; б) пісьмовай заявы тав. Лісуновай Н. П. аб яе згодзе балатыравацца па Магілеўскай гарадской выбарчай акрузе № 60 у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей ад калектыва рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Магілеўскай фабрыкі штучнага валакна імя Куйбышэва,—акруговая выбарчая камісія па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

зарэгістраваць для балатыроўкі кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Магілеўскай гарадской выбарчай акрузе № 60 тав. Лісунову Ніну Пятроўну—1914 года нараджэння, спачуваючую ВКП(б), работніцу-стаханаўку матальнага цэха фабрыкі штучнага валакна імя Куйбышэва, пражываючую ў горадзе Магілеве Беларускай ССР.

У адпаведнасці з артыкулам 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, гэту пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня Магілеўскай гарадской акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей **Сагал.** Сакратар камісіі **Лісоўскі.** Члены: **Кавалёва, Рыманава, Курас, Чарняк, Марозаў, Лукашоў.**

ПАСТАНОВА

Мазырскай акруговай гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад 10 лістапада 1937 года аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе таварыша

Дзмітрыя Фёдаравіча Маркіна

На падставе артыкулаў 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, кандыдатуру ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей тав. Маркіна Дзмітрыя Фёдаравіча, 1899 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1924 года, па соцыяльнаму паходжанню рабочага, выконваючага абавязкі першага сакратара Мазырскага акругкома КП(б)Б, вылучанага агульнымі сходамі рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых мазырскага фанернага завода «Чырвоны Акцябр», завода «Пролетарый», фабрыкі «Профінтэрн», калгаснікаў і калгасніц калгаса «Ўдарнік» Турынскага сельсовета, «Чырвоны сцяг», Валоцкага сельсовета, Мазырскага раёна, і падтрыманую іншымі прадпрыемствамі і калгасамі Мазырскай гарадской выбарчай акругі зарэгістраваць для балатыравання па Мазырскай гарадской выбарчай акрузе № 71.

Старшыня акруговай гарадской выбарчай камісіі **Сухадольская.** Нам. старшыні **Масалкоў.** Сакратар **Амелькін.** Члены камісіі: **Смолікаў, Баравік.**

ПАСТАНОВА

Гомельскай акруговай сельскай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад 11 лістапада 1937 г. аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР таварыша

Сямёна Панцелеймонавіча Астапава

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатур у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 56, 57, 58, 59, 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, ПАСТАНАЎЛЯЕ:

С. П. АСТАПАЎ

на падставе артыкула 60 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, зарэгістраваць для балатыроўкі ў Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе № 75 вылучанук агульным сходам калгаснікаў калгаса «Комсамол Гомельшчыны», гомельскай камуністычнай арганізацыяй і акруговай нарадай даверпаных асоб ад выбаршчыкаў Гомельскага, Уваравіцкага, Лачэрскага, Свяцілавіцкага і Веткаўскага раёнаў кандыдатуру ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР Астапава Сямёна Панцелеймонавіча, 1896 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1932 года, інструктара-машыніста Гомельскага паравознага дэпо Беларускай чыгункі, пражываючага ў мястэчку Насовічы, Царахоўскага раёна БССР.

На падставе артыкула 66 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, уключыць кандыдатуру тав. Астапава Сямёна Панцелеймонавіча ў выбарчы бюлетэнь па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе № 75. У адпаведнасці з артыкуламі 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССІ **Штэйнбах.** Нам. старшыні акруговай выбарчай камісіі **Ветлугін.** Сакратар акруговай выбарчай камісіі **Руткоўскі.** Члены камісіі: **Новікаў, Лапацін, Сяргееў, Ляўданская, Казлоў, Новікава, Сапаўёва, Мельнікава.**

ПАСТАНОВА

Быхаўскай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей таварыша

Суклеты Сілкаўны Еўменавай

На падставе артыкулаў 59, 60, 61, 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Быхаўскай выбарчай акрузе Еўменаву Суклету Сілкаўну, нараджэння 1898 года, беспартыйную, стаханаўку, даярку калгаса «Завет Ільіча», Студзёніцкага сельсовета, Быхаўскага раёна, вылучаную калгаснікамі і калгасніцамі калгасаў: «Завет Ільіча», імя Дзержынскага, імя Кірава, Студзёніцкага сельсовета, рабочымі ацэтонавага завода і інш. арганізацыямі Быхаўскага раёна.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей **Гаўрыленка.** Намеснік старшыні **Цыганаў.** Сакратар **Коўцеў.**

ПАСТАНОВА

акруговай выбарчай камісіі Рэчыцкай выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей калгасніка калгаса імя Дзержынскага таварыша

Архіпа Іванавіча Мацюшэнкі

На падставе артыкулаў 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, Рэчыцкая акруговая выбарчая камісія па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад Беларускай ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Рэчыцкай выбарчай акрузе тав. Мацюшэнку Архіпа Іванавіча—1908 года нараджэння, члена КП(б)Б з 1932 года, селяніна-калгасніка калгаса імя Дзержынскага, Равенска-Слабодскага сельсовета, Рэчыцкага раёна, вылучанага сходам калгаснікаў калгаса імя Дзержынскага, Рэчыцкаа граёна, і сходамі калгаснікаў Камарынскага, Брагінскага і Лоеўскага раёнаў.

Старшыня акруговай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей **Ражкоў.** Намеснік старшыні акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей **Кураўскі.** Сакратар камісіі **Чорнаглаз.** Члены камісіі: **Лісаковіч, Грань, Цырульнікаў, Дзейкун, Ціханава, Пушкін.**

ПАСТАНОВА

акруговай выбарчай камісіі Клімавіцкай выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей таварыша

Васілія Макаравіча Ганчарова

На падставе артыкулаў 60, 61, 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» зарэгістраваць для балатыроўкі ў Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Клімавіцкай выбарчай акрузе кандыдатуру Ганчарова Васілія Макаравіча—1913 года нараджэння, камандзіра РСЧА, члена ВЛКСМ з 1931 года, вылучаную рабочымі і служачымі—завода медыцынскіх устаноў, калгаснікамі калгасаў імя Сталіна, імя Кірава, Клімавіцкага раёна і перадвыбарчымі нарадамі Клімавіцкага, Хоцімскага, Касцюковіцкага і Чырвонапольскага раёнаў.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **Марозаў.** Нам. старшыні **Варанцова.** Сакратар **Шэдаў.** Члены камісіі: **Брыскер, Майсеенка, Самахвалаў, Свірко, Заіс, Максіменка, Савіцкі.**

11 лістапада 1937 года.

Дачка плытагона

Ідуць Бярозаю плыты. А Бяроза разляглася шырока і прывольна. Як казачная блакітная істужка, цягнецца яна. Плывуць плыты, мінаюць надрэчныя вёскі, лясы і балоты.

На пярэдняй лаве стаіць чалавек. Яго мокрыя ногі туга скручаны пяньковымі аборамі. Стаіць ён і паглядае на Бярозу, на яе ясныя воды.

Пра што ён думае?

Можа прыгадвае сваё маленства, можа думае пра сваю вёску Глівіна, дзе засталася яго жонка, яго малыя дзеці.

— Як яны там? Што з імі?—разважае ў думках плытагон.

Змяркаецца. Паўзуць доўгія чорныя пасмы хмар, як гэтыя журботныя думкі. Плытагоны распальваюць агні.

— Сяргей, паварачвай — у бераг прэшся!—крычыць пярэдняму нехта ззаду.

Выкрык разагнаў усе думкі Сяргея. Вокамгненна ён хапіў багор, але позна. Лава стукнулася ў карчысты бераг, ад чаго плытагон ледзь утрымаўся на нагах.

Стоячы па калені ў вадзе, ён адшвартаваўся ад берагу. Зноў пайшлі плыты, скрозь ноч і туман, праз балоты і лясы да Бабруйска.

Праз тыдзень ці болей вярнуўся Сяргей Журанкоў дадому. Змардаваны цяжкай працай, бяссонніцай, ён увайшоў у хату і сеў разувацца.

— Каця была дома?

— Не. Не была.

— Зноў, мусіць, Свіда не пусціў.

— Каб яму дух заняло, ды не адпусціла,—праказала жонка.

— Ох, доля нашанская,—уздыхнула яна.—Дзяўчыне дванаццаць год, гэта каб цябе ў школу паслаў, чалавекам можа, стала-б, а то на працу і на працу.

— Ды да каго на працу?!

— Да Свіды.

Пан Свіда, якому пасылала жанчына праклёны, жыў недалёка ад вёскі Глівіна тут-жа за Барысавам. У яго і працавала дачка Журанкова—Кацярына. З дванаццаці год яна пакутвала ў маёнтку. З дванаццаці год пазнала чэрствы панскі хлеб.

Калі Каця праз некалькі дзён прыйшла дахаты, бацькі ледзь пазналі яе. Пад вачыма стаялі сінія кругі. Згорбленая постаць.

— Ну, як ты, Кацька, маешся?—запытаў бацька.

— Ат, не газары, татка. Як-бы мне пазбавіцца гэтага Свіды.

Але як пазбавішся. Бацька плытагон, за сваю нечалавечую працу ён атрымлівае капейкі. Сям'я з сямі душ; усім патрэбна і пад'есці і апрануцца. Кінуць пана—пайсці жабраваць.

— Мы ўжо з бацькам думалі, як-бы цябе ў людзі вывесці,—звярнулася маці да дачкі.

Кацярына маўчала.

— Дык вось, дачушка, трэба ў школу пайсці, хоць адну зіму павучышся.

Увосень Журанкова Кацярына пайшла ў сельскую школу. Працавала ў пана і вучылася. Толькі не надоўга было гэтае шчасце.

Летам чатырнаццатага года бацьку забралі на вайну. Калі ён вярнуўся з Бярозы, яму прачыталі царскі ўказ і разам з другімі сялянамі—пагналі на фронт, ваяваць супроць немцаў. Кацярына пакінула школу—толькі паўтары гады правучылася яна. Так сустрэла Журанкова Кастрычнік...

*

Палі, узгоркі, лясы—усё знаёмае і блізкае. Дзесьці на Бярозе чутна як ідзе параход.

Перад вачыма паказалася вёска Глівіна. Не, цяпер гэта не Глівіна, а калгас «Шлях Леніна», тут нарадзілася і расла Кацярына Сяргеўна Журанкова. Тут яна пазнала долю і нядолю, гора і радасць.

Высяцца будынкі роднае вёскі. Змянілася Глівіна. Стала не тое. Іншыя людзі сталі глівіяне. Кацярына едзе дадому. За дарогу яна прыпомніла ўсё перажытае...

Дваццаць дзевяты год. Вось яна, яшчэ нясмелая, вясковая жанчына першы раз прыйшла на фабрыку.

— Дачка плытагона,—казалі рабочыя.

— Глядзі, вунь дачка плытагона ля шыбернай корпаецца,—пасміхаліся некаторыя.

— А што-ж тут такога! Рэвалюцыя адкрыла жанчынам шлях. Памятаеш, Ленін казаў, што кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржаваю. Гэта табе не арэхі грызці—справа адказная.

Невысокая, але жвавая і дасціпная, яна ўвіхаецца каля станка.

— Паперу прапускаць трэба вось так,—тлумачыць Кацярыне майстар.

— Добра, разумею.

— Раз! Вот і глядзі, які слаўны карабок!

Так прыступіла плытагонава дачка, дачка Сяргея Журанкова, да працы. У той час бацькі ўжо не было ў жывых. Ён вярнуўся з фронта з надарванымі сіламі. Уваліўся ў хату і адразу сказаў:

— Хопіць, наваяваліся. Другая ўлада цяпер, совецкая.

Больш не ганяў ён і плытоў. Совецкая ўлада дала Журанковым тры гектары зямлі. Набылі яны каня, калёсы, плуг і зажылі па-новаму, як усе глівінскія бедпякі...

Яшчэ і яшчэ наплываюць успаміны.

Партком. Сакратар сядзіць за сталом. Ён чытае газету.

«Вось ён, стаханаўскі рух. Глядзі, што робяць звычайныя людзі. Дзіва, проста дзіва»,—ледзь не ўголас выказаў ён сваё здзіўленне.

Дзверы кабінета расчыніліся. У партком прыйшлі дзве работніцы.

— Таварыш сакратар, мы з Дуняй пераходзім на два станкі,—праказала адна з іх, нізкая, руплівая жанчына. У яе рысах свяцілася іскарка радасці.

— Добра. Але-ж ці ўправіцеся вы?

— Як-жа не ўправімся. Абавязкова, раз бярэмся,—запэўнівала тая-ж жанчына. Гэта была Кацярына Журанкова.

— Тады ўсе работніцы за намі паследуюць,—дадала яе сяброўка, Казак Дуня.

— Калі так, то добра, давайце, давайце. Вот будзе нумар, на ўсю Беларусь прагрыміць.

Назаўтра работніцы прыйшлі на працу.

— Ну, паглядзім, як вы будзеце пацець,—пасміхаліся гультаі.

— Не страшна, калі капля і пральецца,—у тон пасмішкам адказала Кацярына.

Станкі круціліся паранейшаму. Шурхалася папера. З-пад машыны выходзілі гладкія лёгкія карабкі. Час ішоў, як бачыш.

— Што-ж, стаханаўкі, не да абеду—кпілі зноў работніцы ў час абеду.

Крыўдаваць не даводзілася.

Скончыўся працоўны дзень. Майстар цэха падышоў да работніц.

— Па дваццаць кілаграмаў кожная выпрацавала,—абвясціў ён,—пры норме восемнаццаць з паловаю.

— Няўжо па дваццаць?

— Так, дакладна так. Яны першыя стаханаўкі на нашай фабрыцы.

Другі дзень прынёс такі-ж вынік. Працуючы на двух станках, Журанкова і Казак перавыканалі нормы. Гэта ўсхвалявала ўсіх, узнімала працоўны энтузіязм.

У парткоме віншавалі з перамогаю. З гэтага пачаўся стаханаўскі рух на фабрыцы.

Праз чатыры дні ўсе работніцы працавалі на двух станках...

Фурманка спынілася каля хаты.

— Добры дзень!

Маці радасна сустрэла дачку.

— Ну распранайся ўжо ды расказвай навіны якія. Хаця я ўжо чула.—Вось паглядзі,—маці паказала дачцы газету «Большэвік Барысаўшчыны», дзе змешчан партрэт Кацярыны Журанковай.

— Так, мама, у Вярхоўны Совет вылучаюць мяне рабочыя. На мітынгу выступала ў Барысаве. Народу было цьма-цьмой.

Маці тымчасам рыхтавала пачастункі.

Кацярына працягвала:—На фабрыцы зараз я—майстар. Я адказваю за работу васьмідзесяці машын.

У хату прыходзілі суседкі. Яны віталіся з Кацярынай за руку.

— Ого! Якая ў цябе, суседка, дачка. Гэта-ж яна са Сталіным будзе радам сядзець,—гаварылі яны.

— Я-ж гэта кажу. Выйшла мая Каця ў людзі. Калі гэта было чутна, каб дачка плытагона такі гонар заслужыла. Маці прыпомнілася мінулае Каці.

У газеце, што ляжала тут-жа на стале, вылучаліся яркія словы: «Аддамо свае галасы за лепшых дачок і сыноў радзімы—партыйных і непартыйных большэвікоў...»

Да гэтага ліку належыць тав. Журанкова—партыйны большэвік, работніца Барысаўскай запалкавай фабрыкі імя Кірава, дачка плытагона.

Міх. КАЛАЧЫНСКІ.

г. Барысаў.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР,

ЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ АКРУГОВЫМІ ВЫБАРЧЫМІ КАМІСІЯМІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ САЮЗА ПА ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Г. В. АЛЬТШУЛЕР

Н. І. СУГАНЯКА

В. П. ІВАНОЎ

Г. І. КУЛІК

ПАСТАНОВА

акруговай выбарчай камісіі Рэчыцкай выбарчай акругі па выбарах у Совет Саюза аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза таварыша

Грыгорыя Іванавіча Куліка

На падставе 61 артыкула Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, Рэчыцкая акруговая выбарчая камісія па выбарах у Совет Саюза ПАСТАНАЎЛЯЕ:

зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза тав. Куліка Грыгорыя Іванавіча—1890 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1917 года, камандарма другога ранга, вылучанага кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР комуністычнай і комсамольскай арганізацыямі, рабочымі, калгаснікамі, аднаасобнікамі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі, служачымі Рэчыцкага, Гомельскага, Нараўлянскага, Ельскага, Камарынскага і Брагінскага раёнаў.

Старшыня Рэчыцкай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза **Маскалік.** Намеснік старшыні **Якаўлеў.** Сакратар акруговай выбарчай камісіі **Шуцік.** Члены камісіі: **Сцепаненка, Каганскі, Мельнічэнка, Муравейка.**

ПАСТАНОВА

Рагачоўскай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза таварыша

Васілія Паўлавіча Іванова

На падставе артыкулаў 56, 57, 58, 59, 61 і 62 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР і пратаколаў агульных сходаў працоўных—рабочых і служачых соўгаса «Ціхінічы», ціхініцкага спіртзавода, калгаснікаў калгасаў імя Красіна, «Чырвоная ніва», «Ударнік», «1 мая», імя Сталіна, «Праўда», імя Косарэва, «VII з'езд Советаў», «Рассвет», «Совецкая Беларусь», «Чырвоны шлях», «Дыктатура пролетарыята», байцоў і камандзіраў Н-скай часці і грамадскіх арганізацый працоўных Быхаўскага, Жлобінскага, Рагачоўскага і Журавіцкага раёнаў, якія вылучылі кандыдатуру тав. ІВАНОВА ВАСІЛІЯ ПАЎЛАВІЧА, а таксама асабістай пісьмовай заявы тав. Іванова В. П. аб яго згодзе балатыравацца ў дэпутаты Совета Саюза па Рагачоўскай акрузе, акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

на падставе артыкулаў 60 і 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, зарэгістраваць для балатыроўкі ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Рагачоўскай выбарчай акрузе вылучаную агульнымі сходамі рабочых, калгаснікаў, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў Рагачоўскай выбарчай акругі кандыдатуру тав. ІВАНОВА ВАСІЛІЯ ПАЎЛАВІЧА—1911 года нараджэння, члена ВКП(б), настаўніка, працуючага зараз дырэктарам школы медсясцёр у Быхаўскім раёне, пражываючага ў гор. Быхаве.

На падставе артыкула 66 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, уключыць кандыдатуру тав. Іванова Васілія Паўлавіча ў выбарчы бюлетэнь па Рагачоўскай выбарчай акрузе.

У адпаведнасці з артыкулам 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, пастанову апублікаваць да ўсеагульнага ведама.

Старшыня выбарчай камісіі **А. Калкоў.** Намеснік старшыні выбарчай камісіі **Д. Балакіраў.** Сакратар выбарчай камісіі **Крывашэеў.**

гор. Рагачоў.
11 лістапада 1937 года.

ПАСТАНОВА

Мазырскай акруговай выбачай камісіі па выбарах у Совет Саюза аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза калгасніка таварыша

Нікалая Іосіфавіча Суганякі

На падставе артыкулаў 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, Мазырская акруговая выбарчая камісія па выбарах у Совет Саюза ПАСТАНАЎЛЯЕ:

зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза тав. Суганяку Нікалая Іосіфавіча, 1902 года нараджэння, беспартыйнага, калгасніка, старшыню калгаса імя Вароўскага, Дамнавіцкага раёна, вылучанага агульным сходам калгаснікаў калгаса імя Вароўската, агульным сходам рабочых і служачых пеньказавода, лесакамбіната Даманавіцкага раёна і падтрыманага на агульных сходах калгасаў, грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных Даманавіцкага раёна, а таксама на раённых перадвыбарчых нарадах Даманавіцкага, Мазырскага, Лельчыцкага, Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў і на Мазырскай акруговай перадвыбарчай нарадзе.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза **Раманенка.** Нам. старшыні **Пруднікаў.** Сакратар **Лапета.** Члены камісіі: **Сычова, Новікаў, Майсеенка, Аўчыннікаў, Шашко, Корж, Бальшакоў, Макарэвіч.**

ПАСТАНОВА

Гомельскай акруговай сельскай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза ад 11 лістапада 1937 года аб рэгістрацыі кандыдата ў Совет Саюза таварыша

Грыгорыя Вульфавіча Альтшулера

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы і асабістую заяву аб згодзе балатыравацца ў Совет Саюза па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з артыкуламі 56, 57, 58, 59, 60 і 61 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, ПАСТАНАВІЛА:

на падставе артыкула 60 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, зарэгістраваць для балатыроўкі ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе № 489 вылучаную агульнымі сходамі рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, калгаснікаў Гомельскага, Добрушскага, Перахоўскага, Лоеўскага, Буда-Кашалёўскага, Уваравіцкага раёнаў кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тав. Альтшулера Грыгорыя Вульфавіча, 1909 года нараджэння, беспартыйнага, рабочага стаханаўца, з 12-гадовым вытворчым стажам, пражываючага ў горадзе Гомелі.

На падставе артыкула 66 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, уключыць кандыдатуру тав. Альтшулера Грыгорыя Вульфавіча ў выбарчы бюлетэнь па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе № 489 па выбарах у Совет Саюза. У адпаведнасці з артыкулам 65 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, пастанову апублікаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай сельскай выбарчай камісіі **Жыдоў.** Намеснік старшыні **Сінельнікаў.** Сакратар **Кауфман.** Члены камісіі: **Вілетнікава, Міхальчанка, Васілеўскі, Нікіфараў, Окунь, Барушкоў, Правілаў, Ляшкова.**

На калгасным сходзе

Быў незвычайны сход. Дом сацкультуры калгаса імя Сталіна перапоўнены. Пажылыя калгаснікі, сівыя, як галубы, дзяды, жанчыны і моладзь, якая ўпершыню выбірае сваю вярхоўную ўладу, прышлі на гэты важны сход. У мястэчку Пясочнае яшчэ не было такіх сходаў.

Весела і шумна. Стары дзед, Чуш Есіп, расказвае маладым хлопцам і дзяўчатам аб мінулым, аб выбарах валаснога старасты. Моладзь смяецца.

— Дык вот, прыехаў гэта ён на тройцы, мы знялі перад ім шапкі. Ён і кажа нам:

— Мужчыны, стаўлю пяць гарцаў гарэлкі, але каб мяне выбралі за старасту. Выбераце—пастаўлю яшчэ пяць гарцаў. Піце, гуляйце за маё здароўе. Не выбераце—прыпомніце мяне!

*

Пачаўся сход. Сакратар райкома партыі тав. Максімаў гаварыў цвёрда, упэўнена і роўна. У клубе было ціха. Ён гаварыў, што ва ўладзе нашай павінны быць людзі самыя правільныя, самыя смелыя, добрыя і шчырыя таварышы, якія здолелі забяспечыць светлае жыццё ўсім працоўным, якія не давалі-б ніякай спагады заклятым ворагам совецкага народа і калгаснага ладу германа-польскім шпіёнам і іншым наймітам фашызма.

І калгаснікі разумелі таварыша Максімава. Яны ведалі, каго трэба выбраць у самае высокае кіраўніцтва.

Яны адчулі ўсё цяпло, усе клопаты партыі і совецкай улады і асабіста таварыша Сталіна пра іх лёс, пра іх жыццё.

Максімаў скончыў. У зале ціха. Чуваць толькі ціканне гадзінніка.

Але вось просіць слова калгаснік Пятрусь. У зале заварушыліся. Ён вельмі рэдка калі выступае на сходах, хіба толькі тады, калі на сэрцы наспее штосьці магутнае, велічнае, аб чым неабходна сказаць.

— Я ад свайго імя прапаную вылучыць у кандыдаты таварыша Сталіна.—У зале выбухае гром апладысментаў.—Ён у нас самы дарагі і мудры чалавек. Няма ў нас ні старога, ні малога, які не ведаў-бы імя такога вялікага і такога клапатлівага чалавека за наша жыццё, як наш Сталін. Ён—наша надзея, ён—наша праўда, ён—наша жыццё. Я аддаю свой голас за таварыша Сталіна.

Зноў успыхнула авацыя, магутная, аднадушная.

Вось устаў з-за лаўкі пажылы калгаснік Сянькевіч. Яму больш за пяцьдзесят год. Ён добра памятае выбары ў царскую думу, выбары валаснога старасты. Ён памятае і 1905 год, калі песачанцы паўсталі супроць невыноснага здзеку памешчыка Іёдкі.

Уважліва слухае моладзь успаміны аб праклятым мінулым сваіх бацькоў. Ім не верыцца, што тое, аб чым расказваў Сянькевіч,—было сапраўднасцю.

— Я ніколі не думаў і не сніў, што ўбачу сонца яснае, жыццё прасветнае,—гаворыць Нікановіч Марцін.—Усё жыццё думаў аб зямлі, біўся і плакаў за зямлю. Зямля! І калі пачалі будаваць калгасы, я баяўся ўступаць у калгас. Думаў, пачакаю, пабачу. А цяпер! Цяпер толькі калгас мне даў шчасце і радасць. Даў шырокую і прасторную паласу. Вывеў маіх дзяцей у свет, у людзі. Я галасую за калгаснае жыццё, за таварыша Сталіна.

Гаварылі на сходзе яшчэ шмат. І прамова кожнага калгасніка была яркаю і светлаю, як сонечны дзень.

У гэтым годзе на адзін працадзень прыпадае збожжа каля паўтара кілаграма. Гэта дасягненне калгаса імя Сталіна. Год быў засушлівы, а глеба калгаса пясчаная, ёй патрэбна багата вільгаці. Але-ж у параўнанні з мінулым годам—вялікі прыбытак.

Вялікую дапамогу аказаў калгаснікам таварыш Сталін. Шкоднікі, ворагі хацелі падарваць калгаснае будаўніцтва, пасварыць працоўных з совецкай уладай. Не выйшла. Таварыш Сталін выкрыў ворагаў, выкрыў і павыганяў іх з воўчых логаваў.

*

З вялікім захапленнем песачанцы выбіралі кандыдатам у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР знатную трактарыстку свайго раёна Зоню Пятроўну Рачок.

— Я памятаю бацькоў трактарысткі Зоні,—пачаў тав. Кулеш,—з краю вёскі стаяла на курыных ножках пахілая хатка. Дзве дзесяціны пясчанай зямлі меў Пятрусь Рачок. Трое дзяцей ніяк нельга было пракарміць, але Пятрусь спадзяваўся, верыў у будучае. Ды гора спаткала яго, памёрла жонка, пакінуўшы сіротамі яшчэ зусім малых дзяцей. Вечная барацьба з галодным жыццём, барацьба за кавалак хлеба зламала Петруся, ён памёр у 1925 годзе.

Зоня стала і бацькам і матуляй для сваёй сястры і брата. Цяжка, вельмі цяжка было Зоні. Батрацтва ў кулакоў, холад і голад... Здавалася і не будзе канца пакутам. Але прыйшла на дапамогу бойкай па-мужчынску, настойлівай і цвёрдай Зоні, совецкая ўлада.

У 1930 годзе Рачок скончыла курсы трактарыстаў. Яна палюбіла трактар. І ў першы-ж год работы на трактары яна перавыканала норму амаль удвая. У 1931 годзе, як лепшую трактарыстку, яе паслалі на курсы брыгадзіраў. І калі яна прыехала назад у свой раён, абавязалася даць на трактар не менш тысячы гектараў. Сваё абавязацельства Зоня выканала з гонарам. Яе жаночая брыгада дала па 1.100 гектараў на трактар.

— Ведаем Зоню Рачок,—заявіла Сянькевіч Гэля,—нам сорамна, жанчыны, што за нашу кандыдатуру выступаюць толькі мужчыны і хваляць яе, хіба-ж мы не можам нічога сказаць? Гэта-ж яе за тое, што яна перавыконвала норму, шкоднікі былі знялі з работы.

— Дык бачыце, як жанчыну то і за чалавека не лічылі гэтыя гадзюкі агідныя, шпіёны праклятыя. Зоню выбярэм, яна за нас пастаіць. Яна-ж у Маскве была, са Сталіным разам сядзела і з ім за руку віталася.

Жанчыны заварушыліся. Кожнай хацелася сказаць пра Зоню, пра яе брыгаду.

— З любым мужчынам паспрачацца можа. Хай вось з ёю паспрачаюцца,—гаварыла Нікановіч.—От, каб жыла маці і бацька, колькі-б было радасці і шчасця за сваіх дзяцей.

— Праведны чалавек і чэсны.

— Зоню выбярэм!

— Галасуйце, галасаванне пакажа.

Не толькі ў сваім раёне, а і ў акрузе, ва ўсёй Беларусі ведаюць Зоню Рачок як знатнага чалавека, ініцыятара стаханаўскіх метадаў працы на калгасным полі. Яна член Прэзідыума ЦВК БССР і член ЦВК СССР. Зоня—кандыдат КП(б)Б. Сястра яе працуе па-стаханаўску ў калгасе, а брат—у радах Чырвонай Арміі.

І нездарма мора рук было ўзнята за вылучэнне кандыдатам у Совет нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР Зоні Рачок.

Старшыня прэзідыума схода т. Кулеш абвясціў:

— Аднагалосна, пяцьсот чалавек.

*

Праз некалькі дзён песачанцы даведаліся, што іх кандыдат Зоня Рачок дала згоду балатыравацца па Слуцкай акрузе. Гэта вялікі гонар. Тым больш, што песачанцы першымі вылучылі кандыдатуру Зоні Рачок. Яе кандыдатура зарэгістравана выбарчай акруговай камісіяй.

І калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя Сталіна, Песачанскага сельсовета, Капыльскага раёна, аддадуць свае галасы за лепшую дачку сваёй радзімы, знатную стаханаўку—трактарыстку Зоню Пятроўну Рачок.

Анат. АСТРЭЙКА.

„Сям'я Авадзіс"

Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр Беларусі адкрыў свой новы сезон п'есай Маркіша «Сям'я Авадзіс». Вельмі добра, што тэатр пачаў ставіць арыгінальную совецкую п'есу, якая распрацоўвае такую значную тэму, як патрыятызм, любоў да совецкай радзімы на фоне яўрэйскай аўтаномнай вобласці—Біраджана.

Вядома, якія пачуцці павінен выклікаць у гледача падобны спектакль. Глядач апладыруе самаму гераічнаму дзеянню маладога патрыёта нашай краіны, які ідзе на замену загінуўшаму ў баях з японскімі захватчыкамі роднаму брату. Глядач апладыруе новаму тыпу яўрэя, народжанаму Кастрычніцкай рэволюцыяй. Ён апладыруе інтэрнацыянальнаму адзінству народаў СССР. Усё гэта сведчыць аб тым, як совецкі глядач жыве падзеямі нашай рэчаіснасці, наколькі глыбока жыве ў ім пачуццё любві да сваёй радзімы.

Аднак, цэлы рад драматургаў, распрацоўваючы тэму патрыятызма, не заўсёды дастаткова паглыбляюць гэтую тэму, не заўсёды ствараюць глыбокія чалавечыя вобразы, вобразы ў іх паслядоўным развіцці, не ўдумваючыся ў іх побыт, агаварваючы гэтакасцю самога матэрыялу, самой тэмы, да якой глядач не можа заставацца роўнадушным.

Маркіш, адзін з нашых лепшых і найбольш плённых паэтаў, заняўшыся драматургіяй, не засцярог сябе ад гэтай небяспекі. Маркіш у такой ступені захапіўся самім матэрыялам, што цэлы рад чалавечых вобразаў атрымалі недастаткова яркае ўвасабленне ў п'есе. Занадта хуткі ход падзей прымусіў яго вельмі рана паставіць Калмана на месца Шлёмкі. Атрымліваецца так, што ў п'есе вельмі шмат гаворыцца аб людзях, якіх фактычна на сцэне няма і якія гледачу фактычна незнаёмы. П'еса пабудавана амаль цалкам на станоўчых вобразах, і гэта, безумоўна, з'яўляецца радаснай падзеяй у нашай яўрэйскай совецкай драматургіі. У гэтых адносінах Маркіш паступіў вельмі смела, паколькі вобразы станоўчыя значна цяжэй апісаць, чым вобразы адмоўныя. Аднак, трэба ўказаць, што Маркіш часам траціць пачуццё меры, упадаючы ў ненатуральнае, занадта салодкае замілаванне. У гэтых адносінах лепшымі, на нашу думку, сцэнамі з'яўляюцца чацвертая і пятая. Чацвертая карціна вельмі чуллівая. Заул і Сора не ведаюць яшчэ аб пагібелі свайго сына, у той час як усім абкружаючым усё гэта вядома. Аўтар вельмі тонка «абыгрывае» гэтую акалічнасць. Другая і трэцяя карціна запавольваюць дзею п'есы.

Маркіш напісаў п'есу на вельмі важную і актуальную тэму. Гэтым ён запоўніў месца ў яўрэйскай совецкай драматургіі, даўшы першую п'есу аб соцыялістычным патрыятызме. Ён стварыў карысную п'есу, у якой, аднак, не ўхіліўся ад некаторых шаблонаў. Не заўсёды мова персанажаў у дастатковай ступені індывідуалізавана. У п'есе выяўляюцца элементы натуралізма.

Тэатр доўга і сур'ёзна працаваў над пастаноўкай. Ён ставіў сабе задачай стварыць рэалістычны спектакль, які павінен быў закрэсліць фармалістычнае мінулае тэатра. Але змагаючыся з фармалізмам, тэатр упаў у другую крайнасць—натуралізм. Пастаноўшчык спектакля В. Галаўчынер нямала папрацаваў над тым, каб унікнуць у спектаклі тых шаблонных, агульных месц, якія былі ў п'есе. Аднак, Галаўчынеру не хапае творчай фантазіі.

З усіх вобразаў адзін толькі Заул знаходзіцца ў канфлікце з другімі персанажамі. Адсутнасць сына дае яму, як персанажу п'есы, магчымасць штосьці рабіць на сцэне. У меншай меры гэтая магчымасць прадастаўлена другому персанажу спектакля—Соры. Аб астатніх вобразах і таго не скажаш, яны не асэнсаваны ў сваім развіцці. Такімі, як іх застае глядач у пачатку п'есы, яны застаюцца да самага фінала. Ірына толькі паказваецца на сцэне, Калман у яе закаханы. Ні аднай іншай функцыі ў п'есе яна не мае. Так і ходзіць яны па сцэне, закаханыя, між іншым, выражаючы, інтэрнацыянальнае братэрства народаў. Байко, начальнік заставы, пакахаў Броху, дачку Заула. Інакш не можа быць! Ён-жа камандзір, яна рыхтуецца стаць лётчыкам. Каго-ж яму пакахаць, як не яе? Броха, як і цэлы рад іншых вобразаў у спектаклі, не мае ў ім ніякай драматычнай функцыі. Аб іх бясконца размаўляюць. Скажам, аб Ірыне вядуцца пашыраныя гутаркі. Русыя косы і прыгожы твар—гэта, зразумела, гледачу вельмі прыемна. Вобраз Ірыны, як і цэлы рад іншых вобразаў п'есы, драматычна не насычаны. Таму, тэма спектакля вельмі замаруджана. Атмасфера нагартоўваецца толькі тады, калі прыходзіць вестка аб пагібелі Шлёмкі. Іменна таму драматычна больш выйгрышнымі з'яўляюцца чацвертая і пятая карціны.

Мы лічым, што другая і трэцяя карціны павінны быць скарочаны, паколькі нарастанне драматычнага дзеяння пасля адыходу Шлемкі моцна падае. У гэтых сцэнах гаворыцца аб вельмі сур'ёзных рэчах: аб праве на вечнае карыстанне зямлёй, сакратар райкома выкрывае апартуністычна настроенага планавіка Белкіна. Надта доўга гавораць аб «піску» (за сцэнай павінна нарадзіцца дзіцё). Бясконцыя размовы запавольваюць дзеянне. Іменна ў апошняй сцэне на заставе, калі Калман прыходзіць на змену Шлёмку, трэба папоўніць дзеянне матэрыялам. Сцэна сама па сабе зроблена нядрэнна, але гучыць залішне шаблонна (пляска і песні чырвонаармейцаў). Сцэна патрабуе новых дэталяў, новых нюансаў.

Мастацкае афармленне спектакля (мастак т. Марыкс) не ў дастатковай ступені перадае каларыт Далекага Усходу, канкрэтныя асаблівасці далёка-ўсходняга пейзажа. Музыка, напісаная да спектакля кампазітарам т. Палонскім, не стварыла для яго асноўнага лейт-матыва. Яна, па сутнасці, ілюстратыўная. Шкада, што, выходзячы з тэатра глядач не ўтрымаў у памяці новай мелодыі.

Цэлы рад актораў вельмі сур'ёзна працавалі над пераманганнем схематычнасці сваіх вобразаў, аднак, не ўсім у дастатковай ступені гэта ўдаецца.

Сокал (Заул Авадзіс) стварыў вобраз працоўнага яўрэя, са сваім жыццёвым шляхам. Месцамі Сокал іграе вельмі тонка і ў сваіх псіхалагічных пераходах ён натуральны і пераканаўчы. Арончык стварыла праўдзівы вобраз працоўнай мацеры. Драматургам ёй не прадстаўлены матэрыял для пашырэння свайго вобраза. Аднак, глядач ёй верыць, у такой жа ступені, як верыць Сокалу-Заулу. І Сокал і Арончык знайшлі дастаткова мастацкага такту, дастаткова акторскай своеасаблівасці, каб створаныя імі вобразы засталіся ў памяці гледача. Нам здаецца, што ў пятай сцэне, у якой усе акружаючыя заспакойваюць Сору, у Сокала наглядаецца занадта хуткі пераход ад вялікага чалавечага гора да ідэалагічнага асэнсавання яго. Унутранай праўдзівасцю адрозніваецца вобраз Аўрама Авадзіса, бацькі Заула (акт. Фельдман).

Некаторыя вобразы спектакля акторамі зроблены недастаткова глыбока, без той праўдзівай і натуральнай дэталі, якая адрозніла-б вобразы адзін ад аднаго. Мошка (Ягода), Калман (Каган), Бойко (Герштэйн),—усе яны іграюць у натуралістычным плане, хоць адзін з іх больш стрыманы (Герштэйн), другі занадта расперазаўся (Ягода), а трэці (Каган) спалучае ў сабе і тое і другое.

Успомнім, як у свой час актор Трэпель у вобразе Хірыка (спектакль «На 62 участку») пры дапамозе некалькіх дакладна знойдзеных дэталяў стварыў праўдзівы вобраз, які надоўга запамінаецца.

Як відаць, у апошнім спектаклі тэатра агульная ўстаноўка рэжысёра адмаўляла неабходнасць пошукаў асобных дэталяў (ва ўхіленні ад фармалістычнай ігры). У рэзультаце, спектакль мае пэўна натуралістычны прысмак. Мацней за ўсё адбіваецца натуралізм на вобразе, створаным акторам Ягодам, які апынуўся ў палоне штампаў старой акторскай школы. Ягода павінен сябе больш стрымліваць і іграць ва ўнісон з усім калектывам.

Вельмі правільна паступіў рэжысёр спектакля, калі цэлы рад адказных роляў даручыў маладым акторам. Яны сябе ў гэтых ролях, безумоўна, апраўдалі: Ульрых (Ірына), Блушчынская (Броха), Сонкін (Шлёмка) і цэлы рад іншых.

Ірына (актрыса Ульрых), безумоўна, выклікае да сябе гарачыя сімпатыі гледача. Яна выконвае сваю ролю з мастацкім тактам. Часам, Ульрых скавана некалькі ў сваім выкананні, жадаючы, такім чынам, папярэдзіць залішнюю развязнасць, што актрысе ўдалося. Лёгка і натуральна вядзе сваю ролю актрыса Блушчынская. Абодва гэтыя вобразы аўтар не надзяліў драматычнымі функцыямі. Таму чацвертая карціна, у якой Ірына, Броха і Мірл (актрыса Капчэўская) вышываюць сцяг з партрэтам Сталіна, захоўваючы ад маткі вестку аб смерці Шлёмкі, гледачом запамінаецца.

Нам незразумела функцыя такога персанажа п'есы, як Мірл, якая, як відаць, прыехала ў Бірабіджан толькі для таго, каб нарадзіць дзіцё. Чаго дабіваўся аўтар гэтым вобразам—невядома. Няўжо толькі таго, каб да яе сватаўся брыгадзір Флом?

Актор Олендэр, які выконвае ролю брыгадзіра Фломы, вызначаецца адсутнасцю сцэнічнай абаяльнасці. За Олендэрам па пятах ходзіць рыса нейкай «несімпатычнасці», як відаць, звязанай з аднойчы створаным ім вобразам адмоўнага персанажа.

Пры ўсіх недахопах спектакля, тэатр са сваёй работай справіўся. Ён стварыў спектакль, які выклікае ў гледача патрыятычныя пачуцці, якія вельмі цёпла сустракаюцца гледачом. «Сям'я Авадзіс»—спектакль на патрэбную і актуальную тэму.

М. ЗАЛКІНД.

«Сем'я Авадзіс» П. Маркіша ў Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры БССР.
На здымках (злева направа): Заўл Авадзіс—актор Сокал, Мотка Авадзіс—актор Ягода, Аўрам Авадзіс—актор Кулінец, Шлёмка Авадзіс—актор Сонкін.
Фота Каплінскага.

«У пушчах Палесся» Я. Коласа ў Віцебскім гарадскім тэатры.
На здымках: злева—заслужаны артыст рэспублікі Ільінскі ў ролі дзеда Талаша, справа—сцэна з I акта.

Андрэй Александровіч

ПЕСНЯ СОВЕЦКАЙ ЖАНЧЫНЫ

Агнявое наша сонца ярка свеціць над зямлёй,
Я іду дарогай славы, песня радасці са мной.
Я нясу любоў і шчасце, расступілася гара,
Я—совецкая жанчына,
Поўнапраўная жанчына,
Я шчаслівая ў краіне—
Маці і сястра.

Я дзяржаваю кірую, скрозь будую гарады,
Расцвілі вішнёвым цветам вечнай юнасці сады.
Сэрца матчынае цешыць звонкім смехам дзетвара,
Я—совецкая жанчына,
Поўнапраўная жанчына,
Я шчаслівая ў краіне—
Маці і сястра.

А бывала знемагала, гаратлівым быў мой лёс,
Рэчкі бурныя кіпелі ад маіх гарачых слёз.
Больш не вернецца ніколі тая лютая пара,
Я—совецкая жанчына,
Поўнапраўная жанчына,
Я шчаслівая ў краіне—
Маці і сястра.

Я спаборнічаю з сынам на заводах, на палях,
Я над краем узлятаю на крылатых караблях.
Я ў баях загартавала мужны поступ змагара,
Я—совецкая жанчына,
Поўнапраўная жанчына,
Я шчаслівая ў краіне—
Маці і сястра.

Руж чырвоных назбіраю і, любімы наш, табе
Прынясу я шчырым сэрцам, ты наш сцяг у барацьбе,
Прынясу табе, наш Сталін, творца шчасця і дабра,—
Я—совецкая жанчына,
Поўнапраўная жанчына,
Я шчаслівая ў краіне—
Маці і сястра.

Лістапад, 1937.

„У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ“

Дзед Талаш—мастацкае стварэнне народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа, стаў папулярным вобразам у народных масах Совецкай Беларусі па аповесці «Дрыгва». І досыць толькі дзеду Талашу (засл. арт. рэспублікі А. К. Ільінскі) з'явіцца на сцэне, як публіка сустракае яго бурнымі воплескамі.

«У пушчах Палесся»—народна-гераічная п'еса, у якой многа хвалюючага драматызма і лірыкі. У гэтым творы, як і ў аповесці, Колас малюе нянавісць беларускага народа да яго спрадвечных ворагаў—польскіх паноў і беларускага кулацтва, і паказвае гераічную барацьбу беларускіх партызан супроць акупанцкіх войск.

У п'есе ёсць сапраўды хвалюючыя сцэны і яркія, каларытныя вобразы.

Загнаны зверствамі белапалякаў у глухую пушчу, адзінока блукае дзед Талаш са сваёй паляўнічай стрэльбай сярод шматвяковых дубоў, чакаючы вестачкі з роднае вёскі... І раптам радасная сустрэча з Марцінам Рылем, які ўцёк з-пад белапольскага арышту. Гэта цёплая сустрэча двух мужных сыноў беларускага народа паклала пачатак арганізацыі партызанскага атрада.

Вялікае гора і сум, што перажываюць Талаш і яго бядняцкія аднавяскоўцы пры адыходзе апошняй чырвонаармейскай часці, змяняецца буйнай радасцю пры новай сустрэчы Талаша і партызанскага войска з Чырвонай арміяй, з камбатам Шалёхінам і камвзводам Букрэем.

Вялікага драматызма і эмацыянальнага ўздыму дасягае п'еса тады, калі прададзены польскім шпіёнам Гембіцкім і абкружаны з усіх бакоў чырвонаармейскі батальён выратоўваецца партызанскім атрадам дзеда Талаша. Гэтая сцэна—наглядная дэманстрацыя любві беларускага народа да Чырвонай Арміі, якая вызваліла беларускі народ ад здзекаў белапольскіх катаў.

Надзвычайна драматычна Колас малюе перажыванні, пакуты маладой сялянкі Аўгінні, лепшыя пачуцці якой растаптаны кулацкім ботам Васіля Бусыгі. У асяроддзі партызан, у дружбе з Марцінам Рылем, Аўгіння вырастае ў гераічнага вынаходлівага саўдзельніка партызанскай вайны супроць польскіх паноў.

Галоўная сіла п'есы, як і аповесці, у вобразе Талаша. У гэтым вобразе ўвасабляюцца шматвяковыя пакуты беларускага сялянства, народная мудрасць, мужнасць, любоў і нянавісць і цёплы лірызм. Вырасшы ў шырокіх прасторных палескіх пушчах у нястачы і беднасці, у асяроддзі, у якім былі суцэльная непісьменнасць і лютыя хваробы, Талаш разам з усёй палескай беднатой пацягнуўся да сонечных праменняў Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая асвятліла шлях да шчасця, да шчаслівага жыцця.

І калі, як цёмная навальніца ў ясны дзень, па буйных абшарах Палесся загойсала белапольскае войска, агнём і мечам знішчаючы народнае дабро, заліваючы палескія пушчы і палі крывёю беларускага народа,—не вытрымала сэрца старога Талаша, і ён падаўся ў пушчы збіраць народ на партызанскую вайну супроць лютых ворагаў. Ад палескай арганізацыі бальшэвікоў, штабаў Чырвонай Арміі ішлі дырэктывы і дапамога партызанскаму войску.

Талаш—фігура вялікага абаяння. Ён любіць партызан і чырвонаармейцаў бацькоўскай любоўю і заве іх не інакш, як «голубе», «голубе мае родныя».

У Талашы праяўляецца стратэгічны талент, які дапамагае яму выратаваць чырвонаармейскі батальён; выяўляецца аналітычны розум пры допыце кулацкага правакатара Саўкі Мільгуна.

У п'есе багата здаровага народнага юмару, які ідзе ад народнай мудрасці. Гэты юмар не пакідае Талаша, партызана Дарвідошку ў самыя цяжкія і адказныя хвіліны барацьбы.

«У пушчах Палесся» надзвычайна каларытная і сакавітая мова, якая з'яўляецца найбольш моцным элементам у драме. Такія моўныя, лексічныя дэталі, як «голубе» ў Талаша, «заўваж суседзе» ў кулака Бірко, афарызмы і прыслоўі ў Талаша, Саўкі і Дарвідошкі робяць вобразы жывымі і каларытнымі. Агульны лірычны каларыт п'есы яшчэ ўзмацняюць прыгожыя песні, напісаныя Коласам.

«У пушчах Палесся» яшчэ не маналітны драматычны твор. Ёсць тут няўдачы па лініі агульнай кампазіцыі і па лініі асобных вобразаў. Ёсць недапрацоўкі ідэйна-палітычнага зместу.

Вядома, што партызанскі рух на Беларусі быў аб'ектам гнуснай правакацыі, куды пасылаліся польскія шпіёны, выкрытыя ў наш час слаўнай совецкай разведкай, кіруемай Н. І. Ежовым. У п'есе, апрача канакрада Саўкі Мільгуна, якога кулакі падсылаюць да партызан з правакацыйнымі мэтамі, ёсць вобраз вышкаленага шпіёна, польскага паручыка-дэфензіўшчыка Гембіцкага. Правільна задуманы, гэты вобраз, нажаль, вельмі хутка і лёгка выкрываецца, чым зніжаецца сапраўдная гістарычная роля шпіёнаў, падлейшых мярзотнікаў, якія рыхтаваліся затапіць у крыві беларускі народ.

Схематычны і вобраз бальшэвіка падпольшчыка Жыбуля.

Пастановачны калектыў спектакля—рэжысёр В. А. Дарвішаў, мастак Басулаеў і кампазітар Красеў—у інтэрпрэтацыі п'есы пайшоў па лініі раскрыцця яе народнай гераікі, хвалюючага драматызма, лірычнай цеплыні і абаяння герояў, каларытнага пейзажа былой палескай глушы і коласаўскай вобразнай мовы.

В. А. Дарвішаў унікнуў залішняй мітусні і традыцыйнай страляніны ў масавых сцэнах, у сутычках партызан з белапалякамі. Ён ухіліўся ад танных пастановачных эфектаў і сваю ўвагу накіраваў на раскрыццё чалавечых характараў.

П'еса стваралася ў цесным супрацоўніцтве аўтара з тэатрам. І таму як станоўчыя яе вартасці, так і памылкі і няўдачы маюць адлюстраванне ў спектаклі. У некаторых месцах тэатр зрабіў новыя памылкі.

З вялікім майстэрствам Колас малюе здрадніцка-варожую сутнасць беларускага кулацтва, яго ролю агента і апоры польскай інтэрвенцыі, у прыватнасці, у такой сцэне, як пасылка войтам Бусыгай і кампаніяй Саўкі Мільгуна правакатарам да партызан. Пад маскай дабрадзеяў тут выглядае свінячы лыч здраднікаў і ворагаў беларускага народа. А ў спектаклі гэтая сцэна ператварылася ў лёгкамысную гульню войтаўскай кампаніі з Саўкам, гратэскавым стылем інтэрпрэтацыі прыніжаючы вобразы кулакоў і прадажнага прайдзісвета Саўкі.

Не ўсе масавыя сцэны мастацка выразныя і пераканаўчыя (напр., прыход палякаў і сутычка з партызанамі, у 8-й карціне).

З вялікім мастацкім густам Басулаеў аформіў спектакль. Панурыя, скрыўленыя хаткі, бедны хатні ўжытак Талаша і багатая святліца Бусыгі, векавыя дубы, блакітнае неба ствараюць надзвычайны каларыт, які перадае мастацкі арамат коласаўскага твору і з'яўляецца добрым фонам для спектакля.

Вельмі эмацыянальная і мілагучная, прыгожая народна-песенная музыка кампазітара Красева.

Пра ігру актораў.

А. К. Ільінскі іграе Талаша цёпла, лірычна. Разумна і трапна ён абыгрывае характэрныя дэталі, што дадзены Коласам праз рэпліку «голубе» і ў народным юмары мовы Талаша. Ён з вялікім хваляваннем іграе рамантыку адносін да «настаяшчай» стрэльбы. Але часам артыст упадае ў бытавыя інтанацыі і недастаткова выяўляе драматызм вобраза Талаша.

Майстэрска іграе артыст Малчанаў ролю партызана Дарвідошкі, яго незвычайную жыццерадаснасць, рухавасць, народны розум, ствараючы яркі камедыйны вобраз. Рэпліка «ад Варшавы да Масквы не так ужо блізка, панове», выкананая Малчанавым, надзвычай пачуццёва, справядліва выклікае бурныя воплескі ў глядзельнай залы.

Аднак, артыст часам траціць пачуццё меры і пачынае захапляцца беспрадметным камікаваннем, і тады мастацкая маналітнасць вобраза значна парушаецца.

Артыстка Р. Кашэльнікава раскрывае драматызм вобраза Аўгінні, яе складаныя пачуцці і перажыванні, яе вынаходлівасць. Артыст Іваноў іграе камбата Шалёхіна ў цёплых фарбах і радасных інтанацыях. Разумна іграе камандзіра ўзвода Букрэя артыст Шэлег, ствараючы надзвычай абаяльны вобраз простага і шчырага камандзіра.

Артыст С. Скальскі, які іграе Марціна Рыля, дасягае сапраўды хвалюючага драматызма толькі ў сцэне допыту ў контрразведцы, а ў астатнім ён залішне халодны і строгі.

Вобраз войта Васіля Бусыгі артыст Вялікі іграе няроўна, часта збіваючыся з правільных інтанацый і сцэнічнага малюнка—воўка ў авечай скуры,—да вельмі лёгкадумнай гратэскавай інтэрпрэтацыі **вобраза**.

Занадта дабрадушнымі і бяскрыўднымі выглядаюць вясковыя кулакі Бруй і Бірко, суўдзельнікі і субутыльнікі войта, у выкананні артыстаў Міхайлава і Тупіка.

Вясковага злодзея і прайдзісвета Саўку Мільгуна артыст Сяргейчык іграе гратэскава і лёгкадумна, не даносячы ўсёй мярзотнасці і агіднасці Саўкі.

Не пакідае ўражання вельмі каларытны ў аповесці вобраз Панаса, сына Талаша, у выкананні артысткі Лагоўскай.

Спектакль «У пушчах Палесся»—паказальнік вялікай работы Віцебскага дзяржаўнага тэатра і народнага паэта БССР Якуба Коласа. Гэтай работай тэатра і аўтар твору ўнеслі свой каштоўны ўклад у беларускае совецкае тэатральнае мастацтва.

М. МОДЭЛЬ.

Злачынныя справы ў тэатры оперы і балета

Газета «Літаратура і мастацтва» яшчэ ў кастрычніку пісала: «Не гледзячы на ўсе перашкоды, будаўнікі-стаханаўцы поўнасцю выконваюць соцыялістычныя абавязкі, узятыя на сябе перад Оперным тэатрам. Але ёсць і другая пагроза: кіраўнікі тэатра не наладзілі работы свайго калектыва так, каб выканаць узятыя на сябе абавязацельствы, а таксама пагроза, што у новым памяшканні тэатра не будзе што паказваць у дні святкавання XX-годдзя Кастрычніка».

Так яно і выйшла. Тэатр оперы і балета БССР спектакля не паказаў. Узятых на сябе абавязацельстваў па выпуску прэм'еры не выканаў. Многаслоўныя і красамоўныя абяцанні Ярыкава, дырэктара і мастацкага кіраўніка тэатра, аказаліся у лепшым выпадку—бяссэнсавай балбатнёй.

Планаў было многа. Спачатку меркавалася да XX-годдзя Кастрычніка падрыхтаваць і паказаць урыўкі з «Ціхага Дона» і «Лебядзінага возера» і адзін акт «Міхася Падгорнага»—оперы беларускага совецкага кампазітара Е. Цікоцкага. Калі партытура першага акта была Цікоцкім паспешна закончана і таксама паспешна распісаны аркестровыя і харавыя партыі, дырэкцыя тэатра сваю першую пастанову скасавала. Прынята была новая пастанова: выпусціць да кастрычніцкіх дзён поўнасцю оперу Дзяржынскага «Ціхі Дон». К 20-м числам кастрычніка высветлілася, што з шасці карцін оперы будзе выпушчана толькі адна—пятая карціна, яшчэ некалькі дзён, і стала вядома што і да выпуску гэтай, адной толькі, карціны тэатр аказаўся не падрыхтаваным.

Інакш яно і не магло быць пры тым хаосе, самацёку і бясплановасці, што панавалі пры выпуску прэм'еры, і пры абураючым ігнараванні мастацкага совета тэатра. Дастаткова сказаць, што за час работы над «Ціхім Донам» не адзін раз не быў скліканы мастацкі совет. Апрача таго, Ярыкаў для своечасовага выпуску спектакля не забяспечыў матэрыялам тэхнічныя цэхі, ды і самі цэхі да апошняга часу не ўкамплектаваны кадрамі.

Ярыкаў быў прызначаны не толькі дырэктарам, але і,—што зусім не зразумела,—мастацкім кіраўніком тэатра, на што ён па сваёй адукацыі і развіццю не мае ніякага права. Упраўленню па справах мастацтваў не магло не быць вядома музычная адукацыя Ярыкава, якая абмяжоўваецца ўсяго толькі вучобай у маскоўскім тэатральным тэхнікуме (былы Цетэціс) па класу спеваў.

І зусім зразумела, што прызначэнне Ярыкава на такі адказны пост—мастацкім кіраўніком гэтага тэатра—азначала правапіць работу тэатра.

Ярыкаў, з першага-ж дня свайго з'яўлення ў тэатр, праявіў сябе радам злачынных учынкаў. Ім была разагнана з вялікімі цяжкасцямі сабраная па розных гарадах БССР оперная харавая студыя. Па дамоўленасці з Ткачэвічам, Ярыкавым праведзена агіднае парушэнне законаў у адносінах зарплаты работнікам тэатра. Запрашаўся рад лішніх высокааплочваемых (2—3 і 4 тысячы руб. у месяц) салістаў, сярод якіх аказаліся і варожыя элементы, ускрытыя органамі НКВД.

Недаацэнка Ярыкавым беларускіх кадраў выяўляецца не толькі ў матэрыяльнай забяспечанасці актораў. Такія спевакі, выхаванні беларускай оперы, як Дзянісаў, Друкер, Кроз і інш., амаль не загружаюцца работай у тэатры. Напрыклад, у спектаклі «Ціхі Дон» беларускія акторы будуць спяваць, толькі ў другую альбо у трэцюю чаргу. Шэраг работнікаў, пастаўленых Ярыкавым у становішча амаль лішніх людзей, думаюць пакінуць тэатр. Ярыкаў пакіданню тэатра беларускімі акторамі не перашкаджае, ён прама і вядзе іх да гэтага. Ужо звольнены Бароўскі, патрэбны тэатру чалавек, падала заяву аб выхадзе С. Друкер, відная актрыса тэатра, думае падаць заяву аб пакіданні тэатра зусім не загружаная работай актрыса Пукст і інш.

Безумоўна, што Беларускаму Тэатру оперы і балета неабходна дапамога акторскіх і рэжысёрскіх сіл брацкіх рэспублік. Аднак, не належыць, як гэта робіць Ярыкаў, рабіць стаўку толькі на запрошаных людзей, ігнаруючы значэнне таленавітых беларускіх кадраў.

Метад работы Ярыкава—метад запалохвання, адміністратыўнага сваавольства, паўнейшага ігнаравання грамадскай думкі калектыва. Характэрны ў гэтых адносінах адзін з дописаў у насценную газету тэатра. Вось пра што ён гаворыць: «... Ярыкаў не рэагуе на заметкі насценнай газеты. Член рэдкалегіі некалькі разоў зварачаўся да Ярыкава з просьбаю прачытаць цэхавую газету. Ён адмовіўся, матывуючы свой адказ няведаннем мовы. Рэдкалегія згадзілася перакласці заметку на рускую мову, і ўсё-такі ён не прачытаў заметку».

Дрэнна абстаіць справа са стварэннем беларускай совецкай оперы і балета. Калі творчыя работнікі ўсямерна дапамагаюць рабоце кампазітара, дык Ярыкаў не толькі не дапамагае, але бесперапыннымі і залішнімі перапрацоўкамі лібрэта перашкаджае Цікоцкаму, Багатырову і Крошнеру паспяхова скончыць оперу і балет.

Факты кажуць пра тое, што Ярыкаў не можа быць ні дырэктарам, ні мастацкім кіраўніком Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

Упраўленню неабходна зараз-жа стварыць камісію, дасканала праверыць дзейнасць Ярыкава ў гэтым тэатры і высветліць яго палітычны твар: сувязь з ворагамі народа Мутных, былым дырэктарам Вялікага тэатра, а таксама работу Ярыкава ў опернай студыі пры Вялікім тэатры, пазней распушчанай як не апраўдаўшай сябе новым кіраўніцтвам тэатра.

Незразумела, чаму Упраўленне па справах мастацтваў, ведаючы аб становішчы ў Тэатры оперы і балета да гэтага часу не прыняло ніякіх мер да аздараўлення сур'ёзнейшага ўчастка музычнага фронта БССР.

Ордэнаносная рэспубліка павінна мець высокамастацкі тэатр оперы і балета.

Вл. БЕЛКІН.
А. ЕСАКОЎ.

Літаратурны вечар у Клімавічах

У першых чыслах лістапада ў мястэчку Клімавічах адбыўся раённы літаратурны вечар, прысвечаны 20-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Пасля даклада аб развіцці совецкай літаратуры і росквіце юных талентаў выступілі маладыя пачынаючыя паэты і празаікі, якія паказалі сваю творчасць.

Вучань 10-га класа Рыўкін чытаў свой верш, прысвечаны героям-лётчыкам Совецкага Саюза, а таксама мадрыдскім таварышам.

У канцы вечара выступіў ордэнаносец-камандзір, кандыдат у Вярхоўны Совет СССР т. Ганчароў, і старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Марозаў, якія заклікалі юныя таленты яшчэ больш працаваць над сваёю творчасцю.

Э.

Акоп Акапян

Вядомы пролетарскі паэт Арменіі Акоп Акапян, які памёр 13 лістапада ў горадзе Тбілісі, з'яўляўся выдатнейшым прадстаўніком армянскай совецкай паэзіі. Імя Акопа Акапяна карыстаецца вялікай вядомасцю не толькі сярод народаў Закаўказзя, але і ўсяго Совецкага Саюза. Яго вершы перакладзены на грузінскую, азербайджанскую і рускую мовы.

«Памёр народны паэт Арменіі і Грузіі, палкі бальшэвік-прапагандыст, нястомны вястун рэвалюцыі.

Сын саматужніка-рабочага, Акапян быў выключаны з школы за напісанне і распаўсюджванне пракламацыі, з прычыны закрыцця міністрам асветы Дзялянавым армянскіх царкоўна-прыходскіх школ (1885 год). З тых часоў Акапян стаў на шлях рэвалюцыянера-прапагандыста. Ён працаваў у якасці падпольшчыка-бальшэвіка ў царскай Расіі. У гады грамадзянскай вайны працаваў у тылу ворага, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі цалкам прысвяціў сваё жыццё любімай і блізкай прапагандысцкай рабоце, літаратурнай дзейнасці.

Акапян—член ВКП(б) з 1904 года. У гады рэакцыі ён быў членам Закаўказскага партыйнага камітэта і ўваходзіў у рэдкалегію партыйнага органа «Борьба». У 1911 годзе ён па партыйных справах ездзіў за мяжу, дзе сустракаўся з Карлам Лібкнехтам і іншымі партыйнымі таварышамі. У 1914 годзе Акоп Акапян прымаў удзел у партыйнай нарадзе ў Фінляндыі. Акапян быў палкім песняром пралетарыята, яго, верным сынам, яго верным агітатарам і прапагандыстам.

Акапяна называлі армянскім Верхарнам. Ён быў песняром горада, заводаў, фабрык і працы.

Пакінуў нас заснавальнік пролетарскай паэзіі Арменіі, старэйшы пролетарскі паэт Совецкага Саюза.

Праўленне Саюза совецкіх Пісьменнікаў СССР.

* * *

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі паслала наступную тэлеграму з прычыны смерці Акопа Акапяна:

«Ерэван. Праўленню Саюза пісьменнікаў.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокі жаль з прычыны смерці выдатнага песняра сонечнага соцыялістычнага Закаўказзя, народнага паэта Арменіі і Грузіі Акопа Акапяна.

Саюз совецкіх пісьменнікаў Беларусі: Якуб Колас, Лынькоў, Бядуля».

Росквіт народнага мастацтва

Другая ўсебеларуская алімпіяда народнай мастацкай самадзейнасці, што адбылася ў Менску ў дні XX-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі, прайшла са значным поспехам. З калгасных палёў, фабрык, заводаў і совецкіх устаноў з'ехалася 2000 спявакоў, танцораў, музыкантаў, чытальнікаў з 45 раёнаў БССР. Пасланнікі шматлікай арміі гурткоўцаў дзякавалі таварышу Сталіну за шчаслівае і заможнае жыццё. Яны апявалі радзіму, радасна танцавалі, дэкламавалі вершы любімых песняроў совецкага народа. Сустрэліся тры пакаленні: дзяцей, моладзі і старых, каб адзіным калектывам прадэманстраваць свае культурныя поспехі і дасягненні ў галіне самадзейнага мастацтва. Беларускі народ, як і ўсе народы шматнацыянальнага СССР, мае шчасце жыць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі і тварыць свае цудоўныя песні, танцы, казкі, балады і прыпеўкі. Ці то ў Палессі—у Мазыры, у Лельчыцах, у Глуску, ці ў Заслаўі, у Слуцку і ў Цераховцы,—усюды узаконены адпачынак не праходзіць без канцэртаў самадзейнасці. Змяняецца твар беларускай вёскі, мястэчка і горада, узрастае культурны ўзровень беларускага народа, разам з гэтым расце самадзейнае мастацтва. Прайшоўшая алімпіяда служыць яркім паказальнікам гэтага.

Цікавы харавы калектыў калгаса імя Літвінава (Рэчыца), якім кіруе калгасніца т. Лапаціна. Гэта цэльны мастацкі ансамбль. Народныя беларускія песні «Як на гэтай на даліне», «У нашым сяле вяселле будзе», «Каціліся дзы зорачка з неба» выконваюцца харыстамі непасрэдна, з захаваннем асаблівасцей фальклорнага каларыта. Выканаўцы валодаюць тэхнікай харавога мастацтва, маюць добрыя галасавыя якасці. Рэпертуар хора багаты. Апрача беларускіх народных песень, яны спяваюць «Песню пра Сталіна» Рэвуцкага і «Песню пра байца камсамольца» Кніпера.

Тэхнічна падрыхтаваным гуртком з'яўляецца хор клуба дзяржгандлю (Віцебск) пад кіраўніцтвам т. Фірта. Гучнасць гэтага калектыва яркая, спяваюць стройна, рытмічна. Не гледзячы на тое, што харысты выконваюць песні на трох мовах—рускай, беларускай і яўрэйскай, народная асаблівасць кожнай песні захоўваецца.

Песню любіць беларускі народ, яна ўпрыгожвае яго адпачынак, з ёю ідуць на дэманстрацыю, яе спяваюць на вечарынках. Таму такая вялікая колькасць у БССР харавых калектываў. З харавых ансамбляў вылучаюцца калектывы: Прыбыткоўскага сельсовета (Мазырская акруга), калгаса «Перамога» (Лельчыцкі раён), завода імя Варашылава (Менск), бабруйскага і менскага цагельных заводаў.

Значны рост беларускай самадзейнасці відзён і ў тым, што яна мае не толькі харавыя і танцавальныя калектывы, але нават і асобныя ансамблі песні і танца. У першую чаргу, мы маем на ўвазе хойніцкі калектыў, які вядомы за межамі БССР і карыстаецца выключным поспехам. Апрача беларускіх народных песень і танцаў, яны склалі ўласнымі сіламі прыпеўкі аб выбарах у Вярхоўны Совет. Гэты калектыў выкарыстоўвае сродкі мастацтва для агітацыі сярод калгасных мас, ён заўсёды адклікаецца на важнейшыя палітычныя кампаніі. Гэты вопыт варты пераймання і мастацкія калектывы самадзейнасці павінны яго выкарыстаць.

На гэтай-жа алімпіядзе выступіў цыганскі ансамбль калгаса імя Кірава (Полацкі раён), які песнямі расказаў аб старым табарным і сёняшнім калгасным жыцці. Сёняшні калгаснік цыган, побач з беларусам, рускім і яўрэем, з'яўляецца роўнапраўным членам адзінай заможнай калгаснай сям'і.

Цёпла былі сустрэты танцавальныя калектывы, выканаўцы народных рускіх, беларускіх, яўрэйскіх і украінскіх танцаў: гомельскага клуба чыгуначнікаў імя Леніна, віцебскага клуба промкааперацыі і менскіх клубаў—будаўнікоў і дзяржгандлю.

Другая ўсебеларуская алімпіяда. Выступленне сям'і Маліноўскіх.

Значна ўзрасла музычная культура ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Яшчэ зусім нядаўна джаз Політэхнічнага інстытута (Менск), якім кіруе т. Фрадкін, захапляўся танным тэатральшчынай, не зварачаючы ўвагі на якасць ігры. Сёння гэта мастацкі калектыў, які здолеў стварыць кампазіцыю з цыкла «Песні нашай радзімы», непазнавальна вырас. А такіх калектываў у нас шмат, напрыклад: джаз фабрыкі «Кастрычнік» (Менск), зводны струнны аркестр БДУ і Мединстытута, цымбальны ансамбль менскага клуба будаўнікоў ды інш.

Вопыт менскай самадзейнасці, спалучэнне ў зводныя ансамблі—хары, танцавальныя калектывы, духавыя і струнныя аркестры—надзвычай цікавая справа. Гэты вопыт Дом народнай творчасці павінен выкарыстаць і ў далейшым. Музычны твор у выкананні зводных калектываў набывае сапраўды мастацкае гучэнне. З такой колькасцю выканаўцаў ужо можна ставіць паліфанічныя творы.

Ёсць на Беларусі і шмат сем'яў, якія дужа любяць музыку. У гэтых сем'ях ад малога да старога ўсе іграюць на музычных інструментах. На алімпіядзе выступіла выключна музычна здольная сям'я Маліноўскіх з Браніслаўскага сельсовета, Жыткавіцкага раёна. Ян Маліноўскі—10-гадовы хлопчык іграе на шасці інструментах: на скрыпцы, гітары, балалайцы, мандаліне, домры і гармоніку. Адна сям'я складала нядрэнны струнны аркестр, які выконваў сучасныя беларускія песні.

Цымбальны ансамбль сям'і Бохан, з калгаса «Ленінскі шлях», Менскага раёна, выканаў «Лявоніху» і «Коннаармейскую», а 8-гадовая Оля Бохан выканала сола на цымбалах.

Трэцяя сям'я—Русіловіч, калгаснікаў Менскага раёна, выступіла з беларускімі і украінскімі народнымі танцамі.

Ад старэйшага пакалення на алімпіядзе выступілі чатыры жанчыны з калгаса «Профінтэрн», Дрысенскага раёна. Яны выканалі старадаўнія беларускія песні пра мінулае жыццё, потым спявалі прыпеўкі пра вялікага Сталіна і, нарэшце, бадзёра танцавалі кадрыль.

Пачулі мы і жалейку, на якой іграў 68-гадовы Стэсь Фёдар Іванавіч, з Кушнякоўскага сельсовета, Полацкага раёна. І лілася па залу яго абаяльная, цёплая лірычная, «Вясельная песня» і «Песня пра рабіну». І не было таго смутку і жалю, якімі набыла сабе вядомасць беларуская дудка.

Вялікай увагаю карысталіся выступленні Левіна і Кудрашова (Віцебск), якія выконвалі на гітары і банджо рад песень з фільмаў; ігра сляпога паніста Краўцова (Менск), сола на дровах Пашкевіча (Смалявічы); акрабатычны танец віцебскіх рабочых Сято і Вінікава; цікавая дэкламацыя Шафермана, Брыля і Клябанскага.

Алімпіяда выявіла таленавітых спявачак—Бабкову (фабрыка Гомтэкстыль), Левіну і Жукоўскую (Гарадок); здольных танцораў—Махліна выхаванец Віцебскай працкалоніі і Партнога (промкааперацыя, Віцебск). Незлічоная колькасць талентаў выхоўваецца ў народзе.

Другая ўсебеларуская алімпіяда, якая прадэманстравала шмат цікавых дасягненняў самадзейнага мастацтва беларускага народа, на вялікі жаль, была паказана нязначнаму колу гледачоў. А варта было-б, нават пасля кастрычніцкіх свят наладзіць цыкл канцэртаў мастацкай самадзейнасці. Не гледзячы на тое, што другая ўсебеларуская алімпіяда прайшла на больш высокім мастацкім узроўні, у параўнанні з першай алімпіядай, аднак і зараз адсутнічалі драмгурткі, опера (якая ёсць ў Горках), што з'яўляецца значным недахопам алімпіяды.

Неабходна зараз-жа правесці ўсебеларускія алімпіяды асобных прафсаюзаў. Прафесіянальныя саюзы яшчэ надзвычай дрэнна кіруюць гарадской самадзейнасцю.

Дом народнай творчасці, які арганізаваў другую ўсебеларускую алімпіяду, паказаў сваю працаздольнасць і ўменне арганізаваць мастацкую самадзейнасць рэспублікі. Трэба, каб і ў далейшым, займаючыся выключна калгаснай самадзейнасцю, Дом народнай творчасці клапаціўся і вырошчваў з асяроддзя калгаснікаў здольных музыкантаў, спевакоў, артыстаў.

Е. Аляксандраў.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.